Пролетары усіх краёў, злучайцеся!

Чырвоная зьмена

№ 14 (1283) | НЯДЗЕЛЯ, 18-га студзеня 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Дубцы і штыхі падпіраюць капіталістычную сыстэму

Экономічны і палітычны крызісы ў капіталістычных краінах дасягаюць крайняй глыбіні

Працоўныя ўсяго сьвету мобілізуюцца для барацьбы з голадам, з фашызмам і ваеннай небясьпекай

Крызіс душыць капіталістычны сьвет

Ня так даўно капіталістыя запэўнілі ў тым, што ніякага крызісу няма ня можа быць. Гувэр, верны трады... ям высокапастаўленай кучкі цывілізаваных драпежнікаў, пускаў пыл у ...чы працоўны масам.

— Нічога ня можа спыніць прамысловай экспансіі ў такой краіне, як ...лучаныя Штаты.

Гэта гаварылі 1-2 гады таму назад. ...1931 годзе мы чуем зусім іншае. ...жо няма таго моцнага сьцьверджаньня быццам усё добра, а ёсьць разгубленасьць у капіталістых. Палітычныя ...ючы нават баяцца абяцаць што-небудзь добрае ў далейшым.

„Кельнішэ Цэйтунг“ ныхае і згаджаецца:—Дрэнныя справы ўсяго сьвету, дрэнныя справы і Нямеччыны“. ...жка ўздыхае і „Сэндэй Таймс“. „У Ангельшчыне няшчасны год“.

Крызіс душыць капіталістычны сьвет. ...ле капіталістым нават страшна называць слова крызіс. „Дэйлі Мэйль“ ...вяя лёганька, але прымушана згаджацца:—„Краіна шчыльна падышла да ...папраўнай катастрофы“.

— „Мы скачам на вулькане“,—праіраюць дрыжыкі „Кельнішэ Цэйтунг“.

— Сьвет з 1919 году не знаходзіўся ...ад такой пагрозай.

Палітыкі капіталістычнага сьвету ...рымушаны прызнацца, што справы ...нага сьвету, сьвету капіталістых—...рэнныя.

— 10 млн. беспрацоўных у Злучаных Штатах, 5 млн.—у Нямеччыне, ...млн. з лішнім—у Ангельшчыне, ...0-50 проц. усяго пролетарыяту—у ...ольшчы.

„Дзесяткі мільёнаў беспрацоўных, ...карочаньне вытворчасьці, разбурэньне шырокіх мас, узмацненьне капіталістычнага прыгнечаньня“ — вось да ...аго здольна капіталістычная сыстэма. ...іякіх гутарак аб ліквідацыі крызісу ...быць ня можа.

Каб адурачыць працоўныя масы, ...кія стогнуць пад узмацніўшымся капіталістычным гнётам, імпэрыялістыя ...сю адказнасьць за катастрофічнае ...тановішча ўскладаюць на СССР. „Расійская рана на баку Эўропы застаецца вялікім няшчасьцем нашай эпохі, ...пакуль яна не загоіцца, сьвет будзе ...мітусіне і трывозе“.

У краіне будуючагася соцыялізму ...ліквідавана беспрацоўе. Нябачны ...здым працоўных мас стаіць бельмам ...а вачох капіталістычнага сьвету. ...А таму ня дзіва, што адказнасьць за ...тановішча капіталістычнага сьвету ...капіталістыя ўзвальваюць на СССР. ...Выхад з стварыўшагася становішча—...вайна. Вайна — значыць рэволюцыя. ...зусім зразумела, што нават амэрыканскія профэсары прымушаны констатаваць — „самазабойства шляхам ...айны зьяўляецца лёгічным завяршэньнем капіталістычнай сыстэмы“.

Сярод палітыкаў імпэрыялізму разгубленасьць. Ужо стала зусім відавочна, што толькі „глыбокая перабудова ...ўсёй капіталістычнай сыстэмы можа ...запярэдзіць цывілізацыю ад хаосу“.

Працоўныя капаталістычных краін, ...што стогнуць пад капіталістычным ...гнётам, з кожным днём упэўніваюцца ...ў бязвыхаднасьці становішча капіталістычнага сьвету. Працоўныя масы ...мявеюць, становяцца пад сьцягі камуністычнай партыі комсамолу і рэволюцыйнай профсоюзыцыі. Рурская забастоўка, забастоўка 33.000 тэкстыльшчыкаў у Швэцыі, сутычкі працоўных з паліцыяй у Ангельшчыне, Нямеччыне і Амэрыцы, гэроічная барацьба працоўных мас Заходняй Беларусі і Польшчы—усё гэта лепшыя паказчыкі рэволюцыйнага руху працоўных, якія дадуць па руках тым, якія пасьмеюць напасьці на СССР.

„Крызіс ужо дасягнуў сваёй найвялікшай глыбіні“

БЭРЛІН, 15. У бюджэтнай камісіі рэйхстагу адбывалася абгаварэньне дзяржбюджэту на 1930-31 год. Спрэчкі выкрылі, што ня гледзячы на павышэньне падаткаў і на буйную навыку, атрыманую ад швэдзкага запалкавага караля Крэйгера, мінулагодні бюджэт заканчваецца дэфіцытам у 1 мільярд 330 мільёнаў марак.

Выступіўшы ў спрэчках міністр фінансаў Дытрых заявіў у „стрымана оптымістычным тоне“, што патрэбна чакаць „некаторага палепшаньня“ фінансавага становішча і што „крызіс ужо дасягнуў сваёй крайняй глыбіні“.

Заява Дытрыха зводзілася да таго, што ніводны з выдаткавальных артыкулаў бюджэту не падлягае скарачэньню за выключэньнем соцыяльных выдаткаў, якія будуць яшчэ зрэзаны на 550 мільёнаў марак.

Дытрых ні адным словам не абмовіўся аб 4 мільёнах ня гледзячы на тое, што ён толькі некалькі дзён таму назад выступіў у Штутгарце з програмай рэорганізацыі страхаваньня беспрацоўных, якая зводзіцца да перадачы сродкаў, асыгнаваных на дапамогу беспрацоўным, для субсыдаваньня прамысловасьці і ўвядзеньня працоўнай павіннасьці.

Прамова Дытрыха сустрэла таму бурныя, абураючыя выкрыкі комуністычных дэпутатаў. У спрэчках з вялікай прамовай выступіў комуністычны дэпутат тав. Нэйбаўэр, які падпарадкаваў крытыцы анты-рабочую програму ўраду Брунінга. Тав. Нейбаэр указаў, што крызіс ужо дасягнуў сваёй крайняй глыбіні. Разьвіцьцё здарэньняў выкрыла хлусьлівасьць сьцьверджаньняў міністраў. Усе „мерапрыемствы“ ураду, намечаныя на 1930 год у мэтах перамаганьня крызісу, як програма прадстаўленьня працы беспрацоўным, зьніжэньне цэн,—аказаліся сьмехам.

Нячуваны наступ на зарплату, ажыцьцяўляемы ўрадам у агульнанямецкім маштабе,—гаворыць далей тав. Нейбаўэр,—вядзе не да зьмякчэньня экономічнага крызісу, а да яго абвастрэньня, да ўзмацненьня палітычнага крызісу. Для сучаснага ўраду дыктатарскага параграфу надзвычайна характэрна тое, што ваенны бюджэт не скарачаецца ні на адзін пфэніг, у той час, як выдаткі на соц. патрэбы, ня гледзячы на патрэбу, зноў скарочаны.

„Моладзь ня мае права працаваць“

Падатковы прэс кладзецца цяжкім ярмом на плечы працоўнай моладзі. Яна мусіць сваімі маладымі рукамі, пры масавым беспрацоўі, шукаць заработкаў. Калі дарослым беспрацоўным у горадзе даюць хоць жабрацкую дапамогу з „фонду беспрацоўя“, то моладзі да 18 гадоў адмовілі на тэй падставе, што яна „ня мае права працаваць“, а аб сялянскай беспрацоўнай моладзі ў гэтым сэнсе няма чаго і ўспамінаць.

Голад змушае кідацца на ўсе бакі, каб здабыць кавалак хлеба: ідуць капаць у „Сальтана“ бульбу, частка ідзе на работу ў лес, дзе бязьлітасна эксплёатуецца. Моладзь у лесе працуе ад цямна да цямна за два злоты (Корэспод. з Віленска-Троцкага павету).

Рэзолюцыя, унесеная т. Кашэнам, прынята большасьцю

ПАРЫЖ, 15. Палата дэпутатаў, большасьцю 270 галасоў супроць 268, прыняла ўнесеную комуністычным дэпутатам т. Кашэным рэзолюцыю аб неадкладным вызваленьні зьняволеных комуністычных дэпутатаў тав. Марці і Дзюкцё.



На здымку: Паліцэйскія, узброеныя карабінамі, ля ўваходу ў шахту Літфорт у Мээрсе (Нямеччына).

9-ты ўсесаюзны распачаў сваю работу

З вялікай прамовай выступіў т. Кагановіч

МАСКВА, 16. 9-ты Ўсесаюзны зьезд ЛКСМ адчыніўся ўступным словам сэкратара ЦК комсамолу тав. Косарава.

— Два з паловай гады, прайшоўшыя ад VIII-га зьезду ЎсеЛКСМ,—гаворыць тав. Косараў,—увойдуць у гісторыю юнацкага руху, у гісторыю вялізарнейшага будаўніцтва соцыялізму, як гады, на працягу якіх, пры актыўным удзеле комсамолу, соцыялізм з мараў ператварыўся ў жывую практыку.

Ленінскі комсамол пад кіраўніцтвам партыі змагаўся на перадавых, рашаючых вучастках фронту, на якіх атрымаў бліскучыя перамогі. Ленінскі комсамол быў і ёсьць верным дапаможнікам партыі. Наша партыя мае гіганцкую будучыню таму, што кожны малады пролетары і селянін гатоў аддаць усе свае сілы на барацьбу за соцыялізм, каб апраўдаць давер'е партыі. Да 9-га зьезду Ленінскі комсамол прыходзіць ідэйна і організацыйна згуртаваным, як ніколі.

Па прапанове тав. Косарава зьезд ушанаваў уставаньнем памяць т. т.: Леніна, Карла Лібкнэхта, Розы Люксэмбург—лепшых прадстаўнікоў пролетарыяту, якія аддалі жыцьцё ў барацьбе за соцыялізм.

У прэзыдыум, пад бурныя воплескі і выкрыкі „ура“ і „слава“, абраны т. т.: Сталін, Молатаў, Кагановіч, Калінін, Варашылаў, Куйбышаў, Рудзутак, Касіор, Кіраў, Тэльман, Менжынскі, а таксама прадстаўнік ЦК Кітайскага комсамолу. Прэзыдыум, на чале з Сталіным, Молатавым, Кагановічам, пад бурныя авацыі займаюць месцы. З вялікай прамовай выступіў тав. Кагановіч.

Каты карыстаюцца „аўторытэтнай удзячнасьцю“ ўлады

ВАРШАВА, 16. Комуністычная фракцыя сойму разаслала ў друк тэкст пытаньня адносна катаваньняў у Глускай турме. Гэтае пытаньне ня можа быць афіцыйна вынесена ў сойм дзякуючы таму, што ня была сабрана патрэбная колькасьць подпісаў.

У пытаньні ўказваецца, што гвалты над палітычнымі зьняволенымі ў Польшчы прымаюць жахлівыя памеры і формы. З-за сьцен турам і ахранак прасякаюць усё новыя весткі аб усё больш пагражаючых фактах зьверства і зьдзекаў катаў-ахраньнікаў, якія карыстаюцца ўхвалаю і „аўторытэтнай удзячнасьцю“ ўлады і што гвалты ў адносінах рэволюцыйных палітзьняволеных у фашысцкай Польшчы ўведзены ў сыстэму, у асаблівасьці на Заходняй Украіне. У пытаньні ўказваюцца прозьвішчы галоўных катаў: Зарэмба, Катук, Остэцкі і інш.



На здымку: Дэлегат на 9-ы ўсесаюзны зьезд УсеЛКСМ ад Камчацкае акругі. тав. Шчэрбак В.—сэкратар Камчацкага акругкому.

Бунт у польскай турме

ВАРШАВА, 14. У Быдгошчы ў мясцовай турме ўспыхнуў бунт зьняволеных. Зьняволеныя ў колькасьці 400 чалавек забарыкадаваўшыся ў камерах пачалі разьбіваць вокны і ламаць турэмную мэблю.

Бунт падаўлен атрадамі паліцыі і пажарнай дружыны.

Бурнае выступленьне беспрацоўных

ВАРШАВА, 15. У цэлым шэрагу польскіх гарадоў адбываюцца бурныя выступленьні беспрацоўных.

За апошні дзень адбываліся масавыя выступленьні беспрацоўных у Гдыне, Жыжарбаве, Менску-Мазырыцкім, Гродна і г. д.

„Звычай гасьціннасьці“

ПАРЫЖ, 16. Учора ў палаце дэпутатаў выступіў комуністычны дэпутат Дорыё па пытаньню аб тым, калі будзе абгаварвацца ўнесены ім запыт аб „мерах, якія ўрад мае намер прыняць у адносінах расійскіх белагвардзейцаў, якія заяўляюць, што ў іх ёсьць ваенныя організацыі“.

Процытаваўшы заяву генэрала Мюльлера аб гатоўнасьці белагвардзейцаў пачаць вайну і аб пэрспэктывах падтрыманьня іх некаторымі дзяржавамі, Дорыё заявіў: „Я зьвяртаюся да ўраду з запытаньнем, калі ён мае намер выгнаць з Парыжу вышэйшую рускую арганізацыю вайсковых ведаў“.

Далей Дорыё заявіў:—„Мы настойваем перад урадам на роспуску ўсіх гэтых організацый расійскіх белагвардзейцаў і выгнаньня з францускай тэрыторыі ўсіх вінаватых у гэтых дзеях“.

У адказ на выступленьне Дорыё прэм'ер Стэг заявіў:—„Урад просіць палату выказацца за адтэрміноўку пытаньня Дорыё. Я дазволю сабе заўважыць Дорыё, што француская рэспубліка мае звычай гасьціннасьці, якім не заўсёды ўладаюць іншыя“.

Палата прыняла прапанову ўраду.

Забастоўка 2500

ЛЁНДАН, 15. У Дубліне (Ірляндыя) забаставала 2500 будаўнічых рабочых у знак протэсту высунутага прадпрыемцамі патрабаваньня зьніжэньня зарплаты.

Бастуючыя актыўна змагаюцца супроць спроб выкарыстаць штрэйкбрэхераў.

„Чырвоныя атрымліваюць верх“

ШАНХАЙ, 15. Імпэрыялістычныя крыніцы прымушаны прызнаць правал кампаніі прадпрынятай нанкінскім урадам супроць Чырвонай арміі ў Кітаі.

Выходзячая ў Шанхаі амэрыканская газэта „Івнінг Пост“, нядаўна патрабаваўшая бязьлітаснага зьнішчэньня чырвоных, піша:—„маюцца ўказаньні, што чырвоныя атрымліваюць верх у провінцыі Цзянсі. Пасланыя для барацьбы з імі войскі часткова далучыліся да чырвоных, часткова-ж імі абкружаны. У правінцыі Фуцьзян комуністыя неаднаразова атрымлівалі перамогі над урадавымі войскамі і ўноў занялі свае старыя позыцыі. У провінцыі Хубэі чырвоныя абярнулі ў бег урадавыя войскі ля гораду Зазі і працягваюць іх прасьледваць.

Адносна правінцыі Хунань лепш зусім не ўспамінаць: Чан-Кай-шы, нядаўна завяраўшы краіну, што ён неадкладна поўнасьцю зьнішчыць чырвоных, бязумоўна пераацаніў здольнасьці сваіх генэралаў і недзацаніў сіл чырвоных, якія ня толькі ня ўбягаюць пры набліжэньні ўрадавых войск, але самі пераходзяць у наступленьне, наносячы паражэньне ўрадавым войскам“.

Як паведамляе японскае тэлеграфнае агэнства „Сімбун Рэнго“, гандлёвыя колы гораду Чанша прыходзяць да заключэньня, што „кампанія зьнішчэньня комуністых“ у пагранічных раёнах провінцыі Хунань і Цзянсі не прынесла колькі-небудзь заметных вынікаў.

Сто тысяч партбілетаў

ЗАМЕНЯЦЬ ЛЕНІНСКІ СТРАЧАНЫ БІЛЕТ

Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, ажыцьцяўляючы запаветы Леніна, пролетарыят будуе нацыянальную па форме і соцыялістычную па зьместу культуру, выконвае пяцігодку ў чатыры гады

Некаторыя організацыі ня ўвязваюць падрыхтоўку да ленінскіх дзён з задачамі соцыялістычнага будаўніцтва

Застаўшыяся дні скарыстаць для карэннага пераломy

Разгарнуць баявую падрыхтоўку

Праз чатыры дні пролетарыят Савецкага Саюзу адзначае сёмую гадавіну нашай барацьбы і перамог без павадыра сусьветнай пролетарскай рэвалюцыі, непасрэднага кіраўніка і організатара кастрычнікаўскіх перамог—Уладзімера Ільліча Леніна.

Годы без Леніна былі гадамі выкананьня запетаў Леніна—разгортваньне соцыялістычнага будаўніцтва, калі партыя і пад яе кіраўніцтвам рабочая кляса ў саюзе з асноўнай масай сялянства пасьпяхова закончыла пэрыод аднаўленьня народнай гаспадаркі і перашла да рэконструкцыі яе, ажыцьцяўляючы гэнэральную лінію партыі па індустрыялізацыі краіны і рэконструкцыі сельскай гаспадаркі, колектывізацыі яе і на базе суцэльнай колектывізацыі ліквідацыі кулацтва як клясы. Пасьпяхова выканаўшы пляны першых 2 год пяцігодкі і прыступілі да завяршэньня фундаманту соцыялістычнай экономікі.

Мінулыя гады былі гадамі ўпартай і бязьлітаснай барацьбы на двух франтох як супроць контррэволюцыйнага троцкізму, які імкнуўся падмяніць ленінскую лінію нашай партыі „левымі" лёзунгамі, якія на справе вялі да разрыву саюзу пролетарыяту з сярэднім сялянствам, зрыву плянаў нашага соцбудаўніцтва да рэстаўрацыі капітал., так і правага апортунізму, як галоўнай небясьпекі ў партыі, як агэнтуры клясавага ворага.

Толькі ў непрымірымай барацьбе з галоўнай небясьпекай, — правым опортунізмам, „левымі" загібамі і беспрынцыпна-права-„левацкім" блёкам, наносячы руйнуючы ўдар па контррэволюцыйнаму беларускаму нацыянал - дэмократызму, супроць вялікадзяржаўнага шовінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе і шовінізмамі ўсіх колераў партыя дабілася вялікіх посьпехаў у будаўніцтве нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зьместу культуры, у выкананьні плянаў першых год пяцігодкі.

Пролетарыят праводзіць ленінскія дні пад сьцягам яшчэ большага згуртаваньня сваіх шэрагаў вакол партыі Леніна, стварае новыя ўдарныя брыгады, мобілізуе ўсе сілы на выкананьне плянаў 3 рашаючага году пяцігодкі.

Правядзеньне ленінскіх дзён супадае з працай 9 зьезду ленінскага комсамолу. Комсамол, які зьдзейсьніў у асноўным паварот тварам да вытворчасьці ўзяў шэфства над ажыцьцяўленьнем запетаў Леніна па ўсеагульнаму навучаньню і электрафікацыі краіны прыходзіць да ленінскіх дзён з вялікімі посьпехамі.

Поўнае выкананьне плянаў 3 рашаючага году пяцігодкі, правядзеньне яшчэ большай барацьбы за нацыянальную па форме і соцыялістычную па зьместу культуру, конкрэтнае ажыцьцяўленьне шэфства над электрафікацыяй у выглядзе лепшай працы па забясьпечаньню целлавой базы для электрафікацыі,—поўнае правядзеньне ўсеагульнага навучаньня, будзе лепшым помнікам на магіле вялікага павадыра сусьветнага пролетарыяту Уладзіміра Ільліча Леніна.

Комсамольскія і профсаюзныя організацыі павінны скарыстаць застаўшыйся час для яшчэ большай організацыі шырокіх працоўных мас на справу лепшага правядзеньня ленінскіх дзён, увязваючы іх з барацьбой за прамфінплян, за лепшае правядзеньне перавыбараў гарсаветаў і барацьбы за нацыянальную па форме і соцыялістычную па зьместу культуру, бо ленінскія дні—баявая праверка нашай барацьбы і перамог за 7 год бяз Леніна.

Ленінскія дні правядзем пад знакам далейшага соцыялістычнага наступу

Мендзяржбуд разгортвае падрыхтоўку да правядзеньня ленінскіх дзён, як масавую палітычную кампанію, пад знакам мобілізацыі рабочых будаўнікоў на выкананьне і перавыкананьне плянаў 3-га, рашаючага году пяцігодкі, на ўмацаваньне абароназдольнасьці краіны і інтэрнацыянальнага выхаваньня, пад знакам барацьбы за генэральную лінію партыі і закончаньне фундаманту соцыялістычнай экономікі СССР, за організацыю мас на далейшае разгортваньне соцыялістычнага наступу на ўсім фронце.

З 3-га студзеня сярод рабочых Мендзяржбуду распачалася падрыхтоўка да ленінскіх дзён і справаздачна-перавыбарчай кампаніі Менгарсавету. Амаль на ўсіх пабудовах праведзены лятучыя мітынгі аб значэньні 1905 году і чарговых задачах партыі.

15-га студзеня ў памяшканьні Дзяржтэатру адбыўся шырокі сход рабочых будаўнікоў, прысьвечаны 1905 г. і падрыхтоўцы да ленінскіх дзён у сувязі з задачамі 3-га рашаючага году пяцігодкі.

Рабочыя будаўнікі з энтузыязмам ухвалілі наметкі Дзяржплану на 3-ці год пяцігодкі па будаўніцтву нашай гаспадаркі і запэўнілі партыю, што ўскладзеныя на іх задачы па далейшаму разгортваньню соц. спаборніцтва і ўдарніцтва па выкананьню плянаў будаўніцтва будуць выкананы.

Тут-жа на сходзе організавалі 7 ўдарных брыгад.

Рабочы, тав. Гельбэр, унёс прапанову аб зборы сродкаў на карысьць МОПР'у, тут-жа на сходзе сабралі 70 рублёў.

Рыгор Памятны.

Нічога не зроблена

На заводзе „Дрэваапрацоўшчык" (Менск) слаба разгарнуўся па... рыхтоўка да правядзеньня ленін... скіх дзён.

Гутаркі па цэхах і зьменах ... праведзены. Завком толькі мярку... 21 або 22-га студзеня правесьці „вечар успамін", а больш нічога... На вечару успамін выходзіць ну... мар штатгаражкі і 2 цэхавыя на... ценгазэты. Комсамольскі колекты... нічога конкрэтнага не зрабіў ... правядзеньня сьвяткаваньня, нава... лёзунгі не напрыгатаваны.

Трэба адзначыць, што Менс... гарком ЛКСМБ слаба разгарнуў па... рыхтоўку да ленінскіх дзён. Гар... ком комсамолу толькі абмежаваўся... скліканьнем нарады на 17-I, кулы... пропаў колектываў і ячэяк, д... мяркуе абгаварыць аб правядзень... політ-боў і ленінскіх дзён.

Часу засталося мала, неабходна... зараз-жа узмоцніць падрыхтоўку.

Брыгадзір „Ч. З." Г. ФРЫД.

ДАВАЙ ЗМАГАЦЦА РАЗАМ, ТАВАРЫШ ПРОФСАЮЗ!

Сумесна з профсаюзамі, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, комсамол павінен і надалей змагацца за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, за замацаваньне зьдзейсьненага ў асноўным павароту тварам да вытворчасьці

У справаздачы ЦК ЛКСМБ на X зьездзе тав. Палякоў гаварыў: „Прымаючы актыўны ўдзел у рабоце профсаюзаў, мы зможам дабіцца таго, што профсаюзы і комсамол—дзьве масавыя організацыі—будуць праводзіць яшчэ з большымі натугамі, яшчэ з большымі тэмпамі агульную бальшавіцкую справу, справу ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі".

X зьезд ЛКСМБ у сваіх рашэньнях намеціў шырокую програму далейшага паглыбленьня павароту комсамолу тварам да задач соцыялістычнай рэконструкцыі. Трэці, рашаючы год пяцігодкі патрабуе ад комсамолу (максымальнай энэргіі, энтузыязму і ініцыятывы для пасьпяховага выкананьня пяцігодкі ў 4 гады.

Вялізарнейшыя задачы, якія стаяць перад намі, мы зможам выканаць толькі пры ўмове цеснай работы з профсаюзамі, сумеснай барацьбы за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

Ня толькі падтрымаць, але і дапамагчы

Трэба ў штодзённай рабоце комсамолу на прадпрыемствах дабіцца, каб профорганізацыі ня толькі фармальна падтрымлівалі ініцыятыву комсамольцаў, але аказвалі ўсямерную дапамогу правядзенью ў жыцьцё мерапрыемстваў моладзі.

Нядаўна на старонках „Чырвонай Зьмены" мы мелі магчымасьць спаткацца з фактам, калі надзвычайна добрая і вельмі каштоўная ініцыятыва комсамольцаў папяровай фабрыкі „Спартак" (організацыя вытворчай эстафэты для ліквідацыі прарываў у выкананьні прамфінпляну) наткнулася на бяздушна-формальныя адносіны профорганізацыі фабрыкі, якая ня толькі ня ўключылася ў эстафэту, але знашла наогул непатрэбным займацца гэтай справай толькі таму, што гэтая эстафэта праводзіцца па ініцыятыве комсамольскай організацыі.

Вось яркі факт недапушчальных адносін профорганізацыі да сумеснай працы з комсамолам. З такімі фактамі мы можам сустрэцца і на іншых прадпрыемствах БССР.

На Добрушкай фабрыцы „Гэрой Працы" найбольш перадавая на фабрыцы ўдарная брыгада імя Сталіна хацела ўзяць на грамадзкі буксір цэхавую комсамольскую ячэйку для ліквідацыі прарываў у цэху.

Партыйна-профэсыйная організацыя прашла міма гэтага факту.

Узаемаадносіны сумеснай работы комсамолу і профсаюзаў павінны поўнасьцю адпавядаць пасьпяховаму вырашэньню задач, якія стаяць перад профсаюзамі і комсамолам.

У сумеснай працы—залог перамог

Комсамольскія ячэйкі, якія здолелі ажыцьцёвіць сумесную работу з профсаюзамі, дабіліся рэальных вынікаў у барацьбе за прамфінплян. Даволі назваць такія прадпрыемствы, як швэйная фабрыка „Кастрычнік", абутковая фабрыка „Праца". Тут комсамол, сумесна з профсаюзамі, пад кіраўніцтвам партыйных організацый, дабіўся таго, што фабрыкі зьняты з чорнай дошкі і высунуты ў першыя кандыдаты на атрыманьне сьцягу.

Падрыхтоўка кадраў праз асноўную форму ФЗВ, мацаваньне позыцый ФЗВ, стварэньне школ рабочага юнацтва—усё гэта патрабуе сумеснай работы з профсаюзамі.

Даволі яркі факт дрэннага становішча мы бачым у школе ФЗВ чыгуначнікаў (Гомель). Школа дагэтуль ня можа пахваліцца замацаванымі позыцыямі ФЗВ у значнай ступені і таму, што там абсолютна адсутнічае ўсякая работа профсаюзаў. Нават і проф'ячэйкі няма.

Пытаньні абароны экономічных інтарэсаў моладзі маюць вялікае значэньне для пасьпяховага выкананьня програм 3-га году пяцігодкі і падрыхтоўкі кадраў. Гэтую работу комсамол павінен праводзіць таксама сумесна з профсаюзамі.

Рашэньні зьезду—у жыцьцё

У фабзаўкомах, ЦП саюзаў няма прадстаўнікоў комсамолу, яны яшчэ не зьяўляюцца організуючым зьвяном сумеснай работы комсамолу з профсаюзам.

У значнай сваёй частцы нашы „паўпрэды" у профсаюзах займаюцца чым хочаце, але толькі не работай комсамолу. Рашэньні X зьезду ЛКСМБ абавязваюць нас рэзка паставіць пытаньне аб ролі нашых прадстаўнікоў у профсаюзы. Яны павінны абкружыць сябе масавым актывам у штодзённай рабоце, дабівацца павышэньня актыўнасьці работы комсамолу ўнутры профсаюзаў і асабліва—сумеснай работы комсамолу і профсаюзаў.

Гэта—асноўная, важнейшая задача дня. Ад яе ў значнай меры залежыць пасьпяховае выкананьне пяцігодкі і паглыбленьне павароту комсамолу тварам да гаспадарчых задач.

Э. К.

Бясчынствы фашыстых у Нямеччыне



У маленькім горадзе Бэрнаў (з паўгадзіны язды ад Бэрліну), у якім пры выбарах у рэйхстаг прайшлі кандыдаты компартыі, а фашыстыя праваліліся, банда гітлераўцаў (нацыянал-фашыстых) наладзіла напад на сабраўшыхся рабочых. Фашыстыя наладзілі абстрэл памяшканьня, у якім знаходзіліся рабочыя і накінуліся на іх пасьля іх выхаду з жалезнымі кіямі. У выніку 14 чалавек было паранена.

НА ЗДЫМКУ: Цяжка ранены пры нападзе фашыстых—рабочы будаўнік тав. Леман.

ожны комсамолец—вярбоўшчык ленінскага заклiку

Падрыхтоўку да ленінскіх дзён адзначым магутным прылівам бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у колгасы

Камітэты і ячэйкі! Організуйце ініцыятыву комсамольцаў і працоўнай моладзі на барацьбу за новыя колгасы, вярбоўку ленінскага заклiку ў колгасы, за бальшавіцкую падрыхтоўку да вясеньняй сяўбы, на барацьбу з кулацтвам і ліквідацыю яго як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі

рганізаваць ленінскі набор у колгасы

3-м годзе пяцігодкі па БССР па- а быць ахоплена колгасам і ня менш проц. аднаасобных бядняцка-серад- кіх гаспадарак, давесьці пасеўную ічу рэспублікі да 2.698.000 га, тварыць БССР з краіны спажы- ай у краіну вытворчасьці про- аў; малака, мяса, гароднiны, тэх- ых ку ьтур, ільну як галоўных і сельскай гаспадаркі.

нежаньс і пленум ЦК і ЦКК КП(б) вызначыў програму соцыя- ычнага будаўніцтва на вёсцы. На таве захаваньня ленінскага прын- у поўнай добраахвотнасьці аб'яд- ня раздробленых бядняцка-серад- кіх адааасоб ых гаспадарак у ыя соцыялістычныя гаспадаркі Р за 1931 год павінна быць колек- заваны ў сярэднім на 50 проц.

ыканаць гэту гістарычнай важ- ці задачу мы зможам толькі па ве раз ортваньня масавай сыстэ- чнай політычна-выхаваўчай ра- сярод бядняцка-серадняцкіх адна- ных мас, ор анізуючы шырокія колгасьнікаў і аднаасобнікаў на ымірымае змаганьне з кулацтвам і агентурай-правым і „левым“ опор- змам і прымірэнцтвам да іх, у ба- бе з опортуністычнай стаўкай на цёк у колгасным руху, мабіліза- масы на органі ацыю прыліву ў асы і ажыцьцяўленьне політыкі ідацыі кулацтва як клясы на базе ьнай колектывізацыі.

Шэраг комсамольскіх організацый рабілі вял кую работу па ажыць- еньню рашэньняў сьнежаньскага ума ЦК і ЦКК УсеКП(б), і ў дку падрыхтоўкі да зьездаў ком- олу і Ленінскіх дзён паказалі ўзо- сапраўднай бальшавіцкай работы, ератварылі комсамольскія ячэйкі ўдарныя брыгады вярбоўшчыкаў асобнікаў бядняцка - серадняцкіх адарак у колгасы. Слабадзкая, Ла- ская, Малевіцкая ячэйкі, выкары- шы добрыя прыклады работы гасаў, іх гаспадарчыя дасягнен і, рыўшы з комсамольцаў, моладзі лгасьнікаў брыгады вярбоўшчы- уцягнулі дзесяткі аднаасобнікаў тарыя і організавалі новыя кол- сы.

днак гэтыя ўзоры прыкладнай ба- ьбы за новы колгасны прыліў мы жам знайсьці далёка не ва ўсіх самольскіх ячэйках. Шэраг ком- ольскіх ячэек, спаклаўшыся на ртуністычную стаўку—самацёк, па- аб палец ня выцялі для організа- прыліву ў колгас , для організа- новых колгасаў. Трэба пакончыць тай опортуністычнай бязьдзейнась- паасобных ячэек.

ы зьезд ЛКСМБ адзначыў, што рабоце комсамольскай організа- асноўнай задачай у галіне со- лістычнай рэконстр укцыі сельскай падаркі павінна быць: барацьба за ананьне пастаўленых партыяй за- у галіне далейшай колекты ізацыі сельскай гаспадаркі, узмацненьне ючых саўгасаў і колгасаў, машы- ныя сельскай гаспадаркі, выра- ьне жывёлагадоўчай проблемы, бліва сьвінагадоулі, як асноўнай блемы на бліжэйшы час, мэліора- балот, як адзін з сродкаў пашы- ьня соцыялістычнага сэктару на цы і ў вырашэньні проблемы тэх- ых культур, сыравіннай базы для мысловасьці".

ад ажыцьцяўленьнем рашэньняў зьезду ЛКСМБ павінна ўпарта цаваць уся комсамольская органі- ыя.

жыцьцяўленьне рашэньняў Х-га зду ЛКСМБ і падрыхтоўку да ле- скіх дзён комсамольская організа- павінна праводзіць пад лёзунгам білізацыі актыўн сьці ўсіх комса- ьскіх мас і мас працоўнай моладзі барацьбу за магутны кол асны ліў, на ажыцьцяўленьне генэраль- установкі партыі: „да канца пяці- кі—колектывізацыя СССР павінна ь у асноўным скончана".

эйкі і камітэты павінны ў сваёй оце шырока выкарыстаць лепшыя ры форм і мэтодаў масавай рабо- якія маюцца ўжо ў паасобных анізацыях, па ўдарнаму разгарнуць оту вярбоўкі ленінскага набору ў гасы.

астаўшыяся дні да гадавіны сьмер- Леніна павінны даць вялікі штур- к у рабоце ячэек. Трэба выконваць авет Леніна—заўжды і ўсюды яўляць свой пачын, ініцыятыву, і ць адзінай ударнай брыгадай ба- рьбітоў за колекты ізацыю сельскай падаркі.

Кожны комсамолец павінен быць рбоўшчыкам ленінск га набору ў гас.


Выкарыстаць практыку іх работы

Комсамольскія організацыі вёскі часта паказваюць узоры бальшавіцкай падрыхтоўкі да другой колгаснай вясны. У многіх мясцох падрыхтоўка да Х-га зьезду ЛКСМБ IX зьезду УсеЛКСМ і Ленінскіх дзён злучана з разгортваньнем баявой работы па колектывізацыі.

Работа слабодзкіх комсамольцаў—узор змаганьня за колектывізацыю

Слабодзкая комсамольская ячэйка (Мазырскі раён), пад кіраўніцтвам партыйнай ячэйкі, першая ў раёне шырока абмеркавала задачы бальшавіцкай сяўбы і колектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Слабодзкія комсамольцы стварылі групы вярбоўшчыкаў колектывізацыі. Вярбоўшчыкі павялі масавую работу сярод моладзі і адзіным фронтам выступілі ў дапамогу парт'ячэйцы па разгортваньню работы



Сеяць чыстым зернем

сярод батрацтва і беднаты. Упартая работа комуністых і комсамольцаў дала бліскучыя вынікі. У раёне Слабодзкага сельсавету організаваны **два новыя колгасы з 50 гаспадарак.**

Ня гледзячы на шалёнае супраціўленьне кулацтва, якое імкнулася сарваць колектывізацыю, колгасы ўжо значна умацаваны і рыхту цца да вясеньняй пасеўкампаніі.

Зараз вядзецца бальшавіцкае змаганьне па мобілізацыі актыўнасьці бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў на падрыхтоўку да сяўбы, на барацьбу з клясавым ворагам (а клясавым ворагам, трэба сказаць, кішма кішыць увесь Слабодзкі сельсавет). У гэтай барацьбе комсамольцы штодня заваёўваюць усё новыя і новыя посьпехі.

Навокал партыйнай і камсамольскай ячэек згуртаваўся моцны батрацка-бядняцкі актыў. За кошт гэтага актыву растуць і шэрагі ячэек.

Слабодзкая ячэйка комсамолу не абмежавалася адным абмеркаваньнем пляну сяўбы. Плян ужо абмеркаваны і даведзены да колгасаў і вёсак; цяпер ён даводзіцца **да кожнага колгасьніка, да кожнай аднаасобнай гаспадаркі.**

У слабодзкіх колгасах ужо складзены камісіі па мобілізацыі ўнутраных рэсурсаў, **абсталёўваюцца кузьні па баявому рыхтуюцц да другой бальшавіцкай сяўбы.** Вядзецца далейшае змаганьне за разгортваньне колектывізацыі гэтага сельсавету.

Лагунскія комсамольцы (Гомел скі раён) не адстаюць у посьпехах ад комсамольцаў слабодзкай ячэйкі.

Лагунцы падрыхтоўку да ле інскіх дзён і зьездаў комсамолу адзначылі організацыяй сельска-гаспадарчай арцелі „10-ты зьезд ЛКСМБ“.

Комсамольцы - колгасьнікі рашуча змагаюцца за замацаваньне створанага імі колгасу і разгарнулі баявую работу па падрыхтоўцы да веснавой пасеўкампаніі.

Дзякуючы добраму кір ўніцтву Насовіцкай парт'ячэйкі, лагунскія комсамольцы пэратварылі сваю ячэйку ў штаб вярбоўшчыкаў колектыв'зацыі. Намаганьнямі комуністых і комсамольцаў дробны колгас імя 10-га зьезду ЛКСМБ „ператвараецца ў буйную колгасную гаспадарку“ зараз гэты колгас налічвае ўжо 40 бядняцка-с радняцкіх гаспадарак.

У Юравіцкім раёне падрыхтоўка да ленінскіх дзён і зьездаў комсамолу і ў сувязі з перавыбарамі сельскіх саветаў таксама адзначана організацыяй 4-х новых колгасаў, якія яднаюць больш 100 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Работа і посьпехі комсамольскіх ячэек у іх барацьбе за перабудову сельскай гаспадаркі ў значнай меры залежаць ад таго, наколькі работа гэтых організацый забясьпечана партыйным кіраўніцтвам. Там, дзе партыйныя ячэйкі здолелі перабудавацца і павярнуцца тварам а пытаньняў унутрыколгасн га будаўніцтва і адначасова забясьпечыць добрае кіраўніцтва комсамольск мі ячэйкамі,—там мы мае баявую работу і змаганьне комсамольцаў за ыкананьне дырэкты ў партыі і комсамолу ў спр ве соцыялістычнай ерабудовы сельскай гаспадаркі.

Сапраўднае пакаленьне змагароў за колектывізацыю

Малевіцкая ячэйка ЛКСМБ (Жлобінскі раён) паказала сябе ў цэлым, як сапраўднае пакаленьне змагароў за колгасы. Пры актыўным удзеле малевіцкіх комсамольцаў у гэтым сельсавеце створаны два новыя колгасы якія я наюць бол ш 80 бядняцка-серадняцкіх гаспадара .

Малевіцкая ячэйка ЛКСМБ скарыстала новыя формы і мэтоды па організацыі новай хвалі колгаснага прыліву.

Мінулым летам у Ма евіцкім сельсавеце было створана некалькі ініцыятыўных груп колгасаў. Комсамольцы—вярбоўшчыкі, пад кіраўніцтвам партыйнай ячэйкі, скарыстаўшы посьпехі колгасу „Чырвон Пар ызан“, правялі вялікую растлумач льную работу сярод аднаасобнікаў Малевіцкага сельсавету, давёўшы ім пера агу колгаснай гас адаркі над аднаасобнай.

Бальшавіцкая работа—бальшавіцкія вынікі. Вось балянс Малевіцкіх комсамольцаў у іх змаганьні за колектывізацыю.

Ушчэнт разьбіваецца права-опортуністычны паклёп аб бязьдзейнасьці комсамолу аб адсутнасьці актыву і г. д. Комсамольскія ячэйкі, побач з партыйнымі і пад іх кіраўніцтвам, па-бальшавіцку змагаюцца за ажыцьцяўленьне програмы 3 га рашаючага году пяцігодкі.

Брыгада „Ч. З.“ С. і К.

Распачалі работу па організацыі ленінскага прыліву ў колгасы

Гісторыя жыцьця колгасу „Прамень Комуны“, Слуцкага раёну, які організаваўся ў 1929 г. невялікая, але гісторыя ўсіх фактараў і здарэньняў надта багатая і розпастайная.

Спачатку організацыі колгас меў 8 гаспадарак, а зямлі было шмат. Кулакоў у вёсцы было больш, чым колгасьнікаў. Яны сьмяяліся ў вочы: „Надушацца без пары, нічога ня зробяць, бо адны беднякі-культаі. Колгас усё роўна раскідаецца“.

Акрамя агітацыі, кулакі практычна разбуралі колгас. У жніво парэзалі на полі перавяслы больш чым у 360 снапоў, падпальвалі на полі збожжа, выбівалі зубы ад грабельні, кралі розную збрую і г. д. і г. д.

Былі нават тэрорыстычныя напады, як напрыклад, на комсамольца-сэкратара колгасу і ячэйкі КСМ Пратасеню.

Жніво, касавіца — работы хоць адбаўляй. Сіл у колгасе недахоп, зямлі шмат. Аднаасобнікі на дапамогу амаль ня ідуць,—кулацтва і тут дзейнічае.

Але колгас рос і замацоўваўся ў агні клясавай барацьбы. Колгасьнікі паказвалі прыклады, як трэба змагацца з цяжкасьцямі, як працаваць. Ня раз уночы ішлі на працу. Ніводнага фунта не пакінулі на полі.

Правялі разьмеркаваньне прыбыткаў ураджаю. Сярэдні дзённы заработак колгасьніка 2 р. 50 к. Гэты гаспадарчы эфэкт колектыўнай работы даў падваеньне самога колгасу і організаваўся новы колгас.

Падрыхтоўка да другой бальшавіцкай вясны ідзе поўным ходам. Абгаварыўшы пляны райколгассаюзу, сход колгасу аднагалосна ўхваліў даць сустрэчны плян, павялічыўшы плянавыя заданьні на 5 проц.

Сельсавет таксама дзейнічае на-гаспадарску, ён цалкам жыве думкамі колгасьнікаў.

Дзякуючы добрай узгодненай працы колгасаў і сельсавету 35 проц. усяе плошчы сельсавету ўжо колектывізавана.

У сувязі з наступленьнем ленінскіх дзён і набліжэньнем раённага зьезду саветаў, колгасы сельсавету пачалі масавую работу па організацыі ленінскага прыліву аднаасобных бядняцкасерадняцкіх гаспадарак у колгасы.

Паасобныя колгасы вылучылі спэцыяльныя вярбовачныя брыгады па ўцягненьню аднаасобнікаў у колгасы.

Ян. Прыбытак.

Заданьне па сілосу выканалі на 200 проц.

Сіламі комсамольцаў былі выкапаны і засіласаваны 2 ямы, што складае 200 проц. заданьня РК ЛКСМБ.

За выкананьне заданьня па сілосу прэзыдыум РВК прэміяваў ячэйку творамі Леніна і выпісаў на год газэты: „Праўду“, „Комсамольскую Праўду“ „Зьвязду“ і „Чырвоную Зьмену“.

Зараз комсамольская ячэйка распачала ўзмоцненую работу па сустрэчы другой бальшавіцкай вясны, і ўвязваючы яе з магутным прылівам у колгасы. За апошні час у колгас уступіла каля 7 бядняцкасерадняцкіх гаспадарак з навакольных вёсак

Сымон Дубняк, Р. Аўсееў.

Падрыхтоўка пачалася

У першых лічбах студзеня на прэзыдыуме Камарыцкага сельсавету, Петрыкаўскага раёну, было абгаворана пытаньне аб падрыхтоўцы да вясеньняй пасеўкампаніі.

На пасяджэньні прэзыдыуму колгасы „Савецкая Беларусь“ і „Новае Жыцьцё“ інформавалі аб сваёй падрыхтоўчай працы да сустрэчы вясны. У гэтых колгасах заканчваецца рамонт сельска-гаспадарчых машын і ачыстка насеньня.

На тэрыторыі сельсавету маюцца 2 трыеры, якія працуюць днём і ноччу (у дзьве зьмены).

Для агульнага кіраўніцтва і правядзеньня сяўбы вызначана пяцёрка.

Пост „Чырвонай Зьмены“

А. Рэзкі.

Перавыбары саветаў узьнялі прыліў

Справаздачна-перавыбарчая кампанія па Махіраўскім сельсавеце, Полацкага раёну, праходзіла пад знакам організацыі новага колгаснага прыліву і падрыхтоўкі колгасаў і аднаасобнікаў да другой бальшавіцкай вясны.

За час перавыбарчай кампаніі 15 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак уступілі ў старыя колгасы. Пляны пасеўкампаніі даведзены да кожнай вёскі.

Мікола Яравенка.

Давесьці справу да канца

Па ініцыятыве партыйнай і комсамольскай ячэек Марына-Горскага сельска-гаспадарчага тэхнікуму, у падшэфным Дрычанскім сельсавеце за апошні час організаваны два колгасы, якія разам аб'яднаюць каля 20 гаспадарак.

Адзін з гэтых колгасаў пачаў падрыхтоўку да сяўбы: абагульваецца інвэнтар, насеньне і г. д. Другі, які знаходзіцца ў вёсцы Калейным, зусім не аформлены. Партыйная і комсамольская ячэйкі тэхнікуму не праводзяць сярод колгасьнікаў ніякай работы. Студэнцтва тэхнікуму павінна безадкладна давесьці пачатую справу да канца.

Ц. Д.

Імя Х-га зьезду ЛКСМБ

Напярэдадні Х-га зьезду ЛКСМБ у вёцы Жораўка, Дукорскага сельсавету, Сьмілаўскага раёну, па ініцыятыве комсамольскай ячэйкі організаваўся колгас імя 10-га зьезду ЛКСМБ, які зараз налічвае каля 45 членаў.

Колгас прыступіў да практычнай працы: адводу зямлі і падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы.

А. Рак.

Закрыўся зьлёт 25-тысячнікаў

16 студзеня, а 2-й гадзіне дня, зачыніўся першы ўсебеларускі зьлёт 25-тысячнікаў.

Зьлёт аднагалосна прыняў пастанову аб замацаваньні ўсіх 25-тысячнікаў на працы ў колгасах да канца пяцігодкі і адначасова зьвярнуўся з заклікам да ўсіх 25-тысячнікаў Савецкага Саюзу аб безадкладным разгортваньні, пад кіраўніцтвам партыйных організацый, масавай работы па організацыі ленінскага прызыву і вярбоўцы бядняцка-серадняцкіх мас у колгасы.

25-тысячнікі на справе давялі, што яны зьяўляюцца актыўнымі дапамочнікамі партыі ў выкананьні пастаноў XVI партзьезду і сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б. Зьлёт 25-тысячнікаў абвяшчае весьці жорсткую барацьбу з тымі, хто сваімі опортуністычнымі дзеяньнямі зрывае пасьпяховае ажыцьцяўленьне колектывізацыі і выкананьне плянаў вясеньняй пасеўкампаніі.

„Чырвоная Зьмена" дапамагла

— Па зьмешчанай у газэце „Чырвоная Зьмена" заметцы пад назвай „Тут без РСІ не абойдзецца" (наконт самазабясьпечаньня працаўнікоў таварыства „Прыхільнік дзяцей" і няправільнага разьмеркаваньня дэфіцытных тавараў), бюро скаргаў ЦКК РСІ і Менскага РСІ паведамляе, што гэта справа перадана Менскаму прокурору для прыцягненьня вінаватых да крымінальнай адказнасьці.

— На допіс „Рабачком не працуе і ня думае працаваць" Заслаўскі райпрофсавет паведамляе, што факты пацьвярджаюцца. Культурна-выхаваўчай работы сярод рабочых новаорганізаванага савгасу „Зара Захаду" рабачком ня вёў. Райпрофсавет накіраваў на 10 дзён члена райпрофсавету на дапамогу ў ліквідацыі гэтага прарыву.

— Капаткевіцкая РКК РСІ паведамляе, што заметка „Кулак у колгасе" пацьвердзілася. Кулакі Урэцкія вычышчаны з колгасу.

— Полацкая РКК-РСІ паведамляе, што заметка „Опортуністычная практыка" пацьвердзілася. РК ЛКСМБ прыняў адпаведныя меры, зрабіў абсьледваньне комсамольскай ячэйкі ЦРК. У выніку бюро комсамольскай ячэйкі распушчана.

— Клімавіцкі райком КП(б)Б на допіс „Аб недахопах вячэрняга рабфаку" паведамляе, што пытаньне аб становішчы рабфаку абгаварвалася на бюро РК. Вынесены цэлы шэраг прапаноў розным організацыям і ўстаноўвам аб прыняцьці мер для палепшаньня становішча рабфаку.

— Па заметцы „Пастухоў ніхто не абараняе" Клічаўскі РВК паведамляе, што па заметцы было ўтворана расьсьледваньне. Устаноўлена, што пастухі ў в. Селішчы, Клічаўскага раёну, пасьвілі жывёлу без дагавору, ня мелі выхадных дзён, старшыня батрачкому не абараняў інтарэсаў гэтых пастухоў—батракоў. Справа аб ім перададзена ў нарсуд.

— Па заметцы „Выключыць дэзэртыраў з комсамолу", Нараўлянскі РК ЛКСМБ паведамляе, што член КСМ Іоффэ, дэзэртаваў з колгасу, за што і выключан з комсамолу. Але Мазырскі райком ЛКСМБ накіраваў яго ў Слабаду (Маг. р.) у якасьці хатніка, ня гледзячы на тое, што аб выключэньні яго з комсамолу было паведамлена Мазырскаму РК своечасова.

— Азарыцкая РКК-РСІ паведамляе, што па допісу „Гнаць пазбаўленцаў" факты пацьвердзіліся. Прэзыдыум РКК РСІ прапанаваў праўленьню сталоўкі пазбаўленца Цэнцера зьняць з працы, загадчыку вынесена вымова.

КУТОК КОНСУЛЬТАЦЫІ

УТРЫМАНЬНЕ ПАРАСЯТ У ЗІМОВЫ ПЭРЫЯД


Задачы, якія стаяць перад сьвінагадоўляй у соцыялістычным сэктары, патрабуюць увагі ня толькі спэцыялістых у гэтай галіне, але і ўсёй савецкай грамадзкасьці.

Аднак, гэтага энтузіязму мы пакуль ня бачым. Факты гавораць самі за сябе. Калі мы справіліся ў асноўным з комплектаваньнем матачнага гурту сьвінаводных гаспадарках, дык зусім мала чаго зрабілі, каб стварыць належныя ўмовы для ўмацаваньня гэтага гурту і форсаваньня росту сьвінаводчай продукцыі. Будаўніцтва шмат дзе ня скончана па віне гаспадарчых, будаўнічых і грамадзкіх організацый, якія непасрэдна працуюць у гэтай галіне. Ніякія об'ектыўныя ўмовы ня могуць служыць апраўданьнем у невыкананьні пляну будаўніцтва. Непрыстасаванасьць будынкаў асабліва цяжка адбіваецца на маладняку асеньніх і зімовых апаросаў. Зоовэтмінімум у сьвінагадоўлі нідзе ня выконваецца. У выніку — гаспадаркі Сьвінтрасту (на Беларусі) даюць да 40 проц. адходаў.

У колгасах справа таксама ня лепш. Запроэктаваныя сьвінамесцы, ды яшчэ ў не прыстасаваных сьвінарніках, ня могуць задаволіць сьвіней, якія пароссяца ўсю зіму. Што-ж зрабіць, каб падтрымаць гэту „ініцыятыву сьвіней" у барацьбе за прамфінплян? Трэба даць ім і іх патомству адпаведныя ўмовы ўтрыманьня, трэба выканаць хоць элемэнты зоовэтмінімуму. Маленькія парасяткі будуць вельмі ўдзячны за гэта.

Сьвежае, чыстае, сухое паветра, вельмі неабходна парасяці. Трэба штодзённа праветрываць хлявы парасят, а ў „прыстасаваных" сьвінарніках, дзе „вецер ходзіць кругам" трэба даваць ім больш подсьцілкі.

Каб ня трымаць парасяці доўгі час у сырым сьпёртым паветры, трэба выпушчаць іх на прогулку, скарыстоўваючы для гэтага літаральна кожную падыходзячую гадзіну. Парасятам, пачынаючы з трохтыднёвага ўзросту неабходна даць некалькі прагулак у дзень (каля 30 хвілін). Толькі марозы ў 5-8 град., ды мяцеліцы могуць быць выключэньнем з гэтага правіла. Пара-



Ванна для мыцьця сьвіней

сят ад 1/2-2 месяцаў можна выпускаць да галзіны і ў больш дрэннае надвор'е. Парасяты,—што „дзеці", і іх гуляньне залежыць ад іх ае „маткі" сьвінара, якая клапоціцца, каб яе „дзеткі" не хварэлі.

Чысты сухі хлеў і чыстае парасё, гэта другая ўмова ўтрыманьня парасяці. Для сухасьці і чыстаты трэба рабіць усё магчымае, што толькі можна зрабіць у хляве: каналізацыя, сьцёкі, подсьціл, пасыпка калідораў і падлогі торпам, апілкамі, рэзкай з саломы. Уборка хлява ня менш як 1 раз у дзень. У зімовы час трэба абавязкова чысьціць сьвіней і парасят, замест мыцьць іх. Ні ў якім разе не дапускаць назьбіраньня мачы ў хлеве, бо парасяты яе п'юць, асабліва калі няма мінэральнага падкорму і хварэюць ад гэтага паносам.

Нормальная цяплыня ў хлявох—трэцяе запатрабаваньне парасят. У халодным памяшканьні, ды яшчэ дрэнна накарміўшы, нельга трымаць парасят. Гэта—поўная іх пагібель.

Калі ня справіліся зрабіць харошых, цёплых сьвінарнікаў для парасят, можна што-колечы зрабіць для гэтай патрэбы парасяці ініцыятывай і жаданьнем, пачынаючы ад зоотэхніка і канчаючы радавым сьвінаром.

Для парасят трэба ад 4° да 10° цяплыні па С. Абавязкова, каб цяплыня рэзка не мянялася, лепш хай будзе 5-6° ува ўсе суткі, чым 0° раніцою і 15° увечары. Болей як 10-12 гр. цяплыні для парасяці ня трэба, бо гэта таксама шкодзіць іх здароўю. Там, дзе зусім немагчыма паставіць парасят у цёплае памяшканьне, можна паставіць у хляве, альбо ў станку скрыню з саломай; урэшце, калі зусім холадна, палажыць цёплыя бутэлькі з вадой, зрабіць для парасят абгародкі ў хляве, альбо станку з жэрдак апоплаў, абшыць гэтыя абгародкі саломай, матамі і г. д. Урэшце можна ўцяпліць і самы станок, а нават цэлы хлеў саломай, жэрдкамі і матамі. Усё можна і трэба зрабіць, іначай вас чакае правал і няўдача.

Ня прыходзіцца шмат пісаць, як гэта рабіць. Калі будзе жаданьне, воля, энэргія і творчая ініцыятыва зоотэхнікаў, рабочых, сьвінароў, комсамольцаў, колгасьнікаў—усё гэта можна выканаць.

Правільнае кармленьне—чацьвертая ўмова. Шмат у якіх колгасах і савгасах ня кормяць ні матку, ні парасят хоць прыблізна, хоць троху па чалавечаму. Важна даць сьвежы, чысты, цёплы корм, мець чыстую, заўсёды сухую кармушку для парасят. Да рэчы сказаць, кармушка не павінна валяцца пад нагамі, яе трэба мыць, сушыць, калі яна дзеравяная, дзе магчыма можна зрабіць кармушкі з бляхі; хэй сабе і з чорнай.

Скрынку з сьвежым пяском, глінай, крэйдай, вапнай, вугалем, зямлёю попелам для парасят абавязкова трэба трымаць у станку. Інакш парасяты перахварэюць і ня будуць расьці, а таксама ня будуць есьці ў меру. Вось што трэба для ўтрыманьня парасят. Трэба памятаць, што кожнае выгадаванае парася—гэта новы цэнтнэр мяса, гэта новы ўдар па шкодніках, кулаках, і яго агентах—опортуністых.

Трэба спадзявацца, што ўсе працаўнікі, непасрэдна зьвязаны з соцсьвінагадоўляй, гэтыя ўмовы выканаюць. Будзем біць нашых ворагаў новымі гадаванымі парасятамі, новымі цэнтнэрамі мяса.

Зоотэхнік Парахневіч.

Утрыманьне і кармлень заводзкіх сьвіней

Заводзкі кныр павінен быць, як жуць, заўсёды у „заводзкім целе" захаваньнем моцы, бадзёрасьці і п вой энэргіі. Гэта дасягаецца то тады, калі правільна карміць і да яму магчымасьць гуляць на сьве паветры: летам—на пашы, а зім у выгуле, калі мароз ня вышэй градусаў Ц. Без прагулкі кныр робіцца цяжкім, непаваротным ды огул бязуважным к маткам. У вы не павінна быць ніякіх кавалкаў ва, палевьняў і інш., каб кныр н маўся онанізмам. Зусім ня т ўпраўляць кныру у нос пярсьцёнак му што капаць зямлю кныру кар з мэтай мінэральнага харчаваньня.

Улетку як мага часьцей, а ўз раз ці два на месяц трэба кныра м Купаць кныра ўлетку заўсёды т ў натуральным вадаёме з пяшча дном, а калі няма адпаведнага ме тады робіцца спэцыяльная ванна, рам яе можа служыць ванна на Сьвінагадоўчага Інстытуту.

Палавая сьпеласьць у кныроў ступае ў 8-10 месяцаў, у залежна ад пароды. З гэтага-ж часу, м праз кожныя 3 5 месяцаў пуш кныра ў злучку. Звычайна на адным ром пакрываюць 50-60 матак. Але ным і тым-жа кныром можна па ваць матак толькі раз у суткі. У асобных выпадках, калі бывае кныр ідзе ў злучку два разы (цай і ўвечары), то на другі дзень тага кныра зусім ня пушчаюц злучку.

Нормы для кармленьня кн яшчэ распрацаваны слаба. Наогул трэба карміць так, каб кныр ня сыты (сыты кныры дрэнна і ўц злучку і даюць дрэнных парасят) знаходзяцца ў „заводзкім целе". 100 кілё жывой вагі кныру, прык на, трэба даваць 1,1 — 1,2 кармовых адзінак.

Улетку кныру неабходна до паша на канюшыне, а ў крайнім падку даецца скошаная канюшын выгуле. Узімку даецца сена канюш ны, зрэзанае на сілосарэзцы. Ле корм для кныра—высеўкі, ячь авёс, з чаго і робіцца мешанка, раньплоды таксама добры корм кныроў. Аднак, у злучны пэрыо трэбб даваць няпоўна, а дабаў аўса.

Каб мець добрых кныроў, трэб меры магчымасьці ўжываць усе правілы.

ЗУБРЫЦ

АДКАЗНЫ РЭДАКТА

РЭДКОЛЕ

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599